**Н.П.Яканюк,**
*дацэнт*

# НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ: АТРЫБУТЫЎНЫЯ ТЫПАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ

На працягу XX ст. у Беларусі сфарміравалася прынцыпова новая для яе з'ява — народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі. Яна існуе адначасова і паралельна з інструментальным фальклорам, гарадскім бытавым музіцыраваннем і акадэмічным інструментальным мастацтвам.

Па аналогіі з культурамі, якія складваюцца паводле асобных акадэмічных музычных інструментаў — фартэпіяннай, скрыпічнай, аркестравай, — мы разглядаем народна-інструментальную культуру як адносна самастойную частку цэласнай музычнай культуры грамадства, як своеасаблівую шматузроўневую падсістэму, якая фарміруецца вакол традыцыйных інструментаў таго ці іншага народа. Кампанентамі гэтай культуры з'яўляюцца перш за ўсё пэўныя мастацкія каштоўнасці — самі музычныя інструменты; музыка, якая для іх ствараецца; методыка навучання ігры на іх; тэарэтычныя веды ў галіне гэтай культуры і інш. Да іх належаць таксама разнастайная дзейнасць па стварэнні пералічаных вышэй каштоўнасцей і іх стваральнікі — музычныя майстры, кампазітары, выканаўцы, даследчыкі, метадысты. У кола культуры трапляюць яе рэцыпіенты, мастацкія патрабаванні якіх абумоўліваюць яе фарміраванне і развіццё.

Вельмі падобная па сваіх знешніх праявах на інструментальную культуру вуснай традыцыі культура пісьмовай традыцыі, не тоесная аўтэнтычнаму народнаму інструменталізму. Для яе ўласцівыя некаторыя рысы. Яны паўтараюцца ў самых розных нацыянальных культурах,

устойлівасць і ўсеагульнасць якіх дазваляе разглядаць іх як атрыбутыўныя тыпалагічныя прыметы культуры дадзенага тыпу. Для народна-інструментальнай культуры Беларусі пісьмовай традыцыі характэрны таксама і некаторыя рысы своеасаблівасці, якія вызначаюць яе нацыянальную прыналежнасць і адметнасць. Праведзены намі параўнальны аналіз дазваляе вылучыць тыя агульнатыпалагічныя і нацыянальна-характэрныя рысы народна-інструментальнай музычнай культуры Беларусі, якія, з аднаго боку, набліжаюць, а з другога — адрозніваюць яе ад аналагічных культур іншых народаў свету.

Асноватворнай рысай культуры аналізуемага тыпу з'яўляецца тое, што яна абапіраецца на традыцыйныя народныя музычныя інструменты, якія могуць выкарыстоўвацца як у аўтэнтычным, так і ў мадыфікаваным выглядзе.

Важнай агульнай атрыбутыўнай рысай народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі мы лічым функцыянаванне народных музычных інструментаў у сцэнічных умовах. (У дадзеным выпадку паняцце “сцэна” трактуецца намі шырока, не як пабудова канцэртнай залы, а як умоўная пляцоўка, якая прызначана спецыяльна для выканаўцы і адмяжоўвае яго ад слухачоў.)

Мы разглядаем сцэнічную форму існавання народных інструментаў як дэтэрмінуючую тыпалагічную рысу народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі, бо яна абумоўлівае асаблівасці яе эстэтыкі. Эстэтыка гэта, арыентаваная на агульнапрызнаныя еўрапейскія крытэрыі сцэнічнага музычнага мастацтва, знаходзіць адлюстраванне ва ўсіх кампанентах, што ўваходзяць у гэтую культуру. Крытэрыі сцэнічнай выканальніцкай практыкі патрабуюць высокамастацкага рэпертуару, які ствараецца прафесійнымі кампазітарамі ў адпаведнасці з жанрава-стылявымі нарматывамі той ці іншай краіны і гістарычнай эпохі. Яны патрабуюць выканаўцы-інтэрпрэтатара, стылявая манера

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якога адаптавана да ўспрымання слухача, выхаванага ў межах еўрапейскай канцэртна-выканальніцкай традыцыі. Гэтымі крытэрыямі дэтэрмінуецца імкненне да выхавання новай слухацкай аўдыторыі, стандартызаваны густ якой мэтанакіравана фарміруецца кампазітарамі і выканаўцамі і "падцягваецца" да больш высокага ўзроўню, адпаведнага ўзроўню развіцця самой культуры. Нарэшце, гэтыя крытэрыі якасна ўплываюць на канструкцыю музычных народных інструментаў, арганалагічныя і арганафанічныя характарыстыкі якіх павінны быць спецыяльна прыстасаваны да прасторава-акустычных умоў канцэртнай залы.

Не менш важная рыса, якая зафіксавана ў самім паняцці "культура пісьмовай традыцыі" — гэта пісьмовая фіксацыя музычнага тэксту ў адпаведнасці з агульнапрызнанай сістэмай еўрапейскай пяцілінейнай натацыі. Гэтым культура пісьмовай традыцыі карэнным чынам адрозніваецца ад культуры вуснай традыцыі — фальклору. На дадзеную прымету звяртаюць увагу многія даследчыкі (Б.Асаф'еў, М.Імханіцкі, І.Мацыеўскі, Ю.Бойка). І менавіта яна дэтэрмінуе асаблівыя ўмовы творчасці кампазітараў і выканаўцаў, якія дзейнічаюць у межах фіксаванага нотнага тэксту.

Яшчэ адна рыса народна-інструментальнай культуры адзначанага тыпу — сінтэз традыцый музычнага фальклору і еўрапейскага акадэмічнага музычнага мастацтва на ўзроўні ўсіх кампанентаў. Дваістая прырода гэтай культуры выяўляецца ў самой яе назве. З'яўляючыся народнай па сваіх вытоках (народна-інструментальная), яна ў той жа час арыентавана на агульнаеўрапейскія акадэмічныя традыцыі (сцэнічная, пісьмовая).

Асноўным шляхам узаемадзеяння традыцый фальклорнага і акадэмічнага інструменталізму з'яўляецца арганічнае спалучэнне аб'ектыўных асаблівасцей нацыянальнага музычнага фальклору і класічных прыёмаў кампазітарскага і выканальніцкага агульнаеўрапейскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстэрства. Прычым гэта не простае механічнае замяшчэнне тых ці іншых сродкаў выразнасці, агульных для нацыянальнай і еўрапейскай музычных культур (мелодыі, рытму, фактуры, тэмбру, выканальніцкіх прыёмаў і інш.), а такі іх сплаў, які вядзе да стварэння якасна новай, сапраўды цэласнай, эстэтычна- каштоўнай мастацкай з'явы.

Такім чынам, сярод вылучаных намі прымет народна-інструментальнай культуры Беларусі пісьмовай традыцыі маюцца абагульняючыя, атрыбутыўныя (г.зн. тыя, якія выяўляюцца на ўзроўні тыпу). Да іх належаць апора на традыцыйныя народныя музычныя інструменты; функцыянаванне гэтых інструментаў ва ўмовах канцэртнай эстрады (сцэны); выкарыстанне еўрапейскай сістэмы натацыі і тэмпераванага дванаццаціступеннага гукараду; сінтэз традыцый нацыянальнага музычнага фальклору і акадэмічнага інструментальнага мастацтва.

Акрамя агульных прымет, для народна-інструментальнай сцэнічнай культуры Беларусі ўласцівыя і многія рысы нацыянальнай характэрнасці і своеасаблівасці, якія вылучаюць яе на фоне іншых культур падобнага тыпу і дазваляюць сцвярджаць яе самастойнасць і унікальнасць.

Трэба падкрэсліць, што нацыянальнае выяўляецца тут не толькі ў этнічным плане як шырокае выкарыстанне элементаў музычнага фальклору пэўнага (у дадзеным выпадку беларускага) этнасу. Дамінуючую ролю адыгрываюць традыцыі мастацкага мыслення і прыёмы прафесійнай тэхнікі, якія склаліся ў прафесійнай мастацкай творчасці кампазітараў і выканаўцаў-інструменталістаў краіны. Гэтыя традыцыі, як вядома, фарміраваліся на працягу XX ст. і ўяўляюць складаны сімбіёз элементаў рускай, заходнееўрапейскай і ўласна беларускай музычных культур. Аднак, як сведчыць мастацкая практыка канца XX ст., па меры развіцця народна-інструментальнай творчасці сцэнічнага тыпу этнічнае сцвярджаецца ў ёй больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераканаўча, таму яе нацыянальная спецыфіка раскрываецца ўсё больш поўна і шматгранна.

Сувязі народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі з нацыянальным інструментальным фальклорам выяўляюцца перш за ўсё ў запазычванні музычных інструментаў традыцыйнай вясковай музычнай практыкі. Прычым, калі на этапе станаўлення ў сцэнічнай культуры выкарыстоўвалася толькі нязначная іх частка (цымбалы, дудка і ліра), то па меры вывучэння нацыянальнай інструментальнай музычнай спадчыны больш шырокае кола інструментаў пачынае функцыянаваць у новых сцэнічных умовах. На працягу апошняга дзесяцігоддзя XX ст. амаль усе вядомыя народныя музычныя інструменты Беларусі набылі новае жыццё.

Даволі часта прадстаўнікі народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі звяртаюцца да нацыянальна-характэрных формаў інструментальнага ансамблевага музіцыравання. Так, паралельна са стандартным уніфікаваным складам беларускага аркестра народных інструментаў з вядучай цымбальнай групай (тыпу Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І.Жыновіча), які фарміраваўся пад моцным уплывам сімфанічнага аркестра і аркестра рускіх народных інструментаў, пачаў выкарыстоўвацца аркестр іншага складу. Створаны па прынцыпу “разрастання” традыцыйнага інструментальнага ансамбля (скрыпка, цымбалы, гармонік, бубен ці барабан) такі аркестр уключае ўжо некалькі раўнапраўных груп. Сярод народна-інструментальных ансамбляў, функцыянуючых у сцэнічных умовах, у наш час часта сустракаюцца ансамблі так званага фальклорнага тыпу, якія па сваім складзе набліжаюцца да традыцыйных вясковых. Прычым часам у іх знаходзяць адлюстраванне мясцовыя традыцыі розных рэгіёнаў рэспублікі.

Як і раней, сувязь з фальклорнымі традыцыямі выяўляецца ў кампазітарскай творчасці. Праўда, калі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1930—1970-я гг. кампазітары абмяжоўваліся ў большай ступені апорай на фальклорны тэматызм, то ў музыцы апошняй чвэрці XX ст. выкарыстоўваецца больш шырокі спектр традыцыйных сродкаў выразнасці. У сучасных творах для народных інструментаў сустракаюцца не толькі асобныя нацыянальныя сродкі музычнай выразнасці (ладаінтанацыйныя, метрарытмічныя, фактурныя, тэмбравыя), але і цэлы іх комплекс. Кампазітары абапіраюцца на характэрныя для беларускага фальклору сферы вобразнасці, агульныя асаблівасці драматургіі, прынцыпы і метады формабудовы, выкарыстоўваюць спецыфічныя прыёмы, уласцівыя выканальніцкай манеры народных музыкантаў, што дазваляе гаварыць аб глыбокім засваенні і глыбінным мастацкім пераасэнсаванні імі нацыянальнага музычнага фальклору.

Вывучэнне народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі Беларусі ў канкрэтных праявах на ўзроўні асобнай культуры і параўнанне яе з аналагічнымі культурамі іншых народаў даюць магчымасць вылучыць рысы яе нацыянальнай адметнасці. Адной з іх з’яўляецца скачкападобны характар сцэнічнага засваення традыцыйнага музычнага інструментарыя. Звыш сямідзесяці гадоў у сцэнічнай практыцы выкарыстоўваліся толькі цымбалы, дудка і ліра. На працягу ж апошняга дзесяцігоддзя XX ст. у сцэнічна-канцэртную практыку былі ўведзены практычна ўсе апісаныя ў навуковай літаратуры музычныя інструменты беларускага народа.

Заўважым, што толькі цымбалы выкарыстоўваліся як сольны, ансамблевы і аркестравы інструмент. Дудка і ліра былі выключна эпізадычнымі аркестравымі інструментамі. Адсюль яшчэ адна характэрная рыса народна-інструментальнай культуры Беларусі — трактоўка народных інструментаў як мастацкі няроўнакаштоўных, і ў сувязі з гэтым іх нераўнамернае ўключэнне ў розныя формы выканальніцкай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звяртае ўвагу і такая рыса, як абмежаванне канцэртна-сцэнічнай выканальніцкай практыкі выключна мадыфікаванымі народнымі інструментамі. У адрозненне ад некаторых іншых народна-інструментальных культур, такіх, напрыклад, як культура Літвы, Узбекістана, Казахстана, у Беларусі ў сцэнічных умовах амаль не выкарыстоўваюцца традыцыйныя народныя інструменты ў іх натуральным, аўтэнтычным выглядзе.

Асаблівасцю айчыннай народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі з'яўляецца тое, што яна абапіраецца на традыцыйныя народныя інструменты не толькі беларускага, але і рускага народаў. Так, адначасова і паралельна з цымбаламі, дудкай і лірай ў ёй ўжываюцца домра, балалайка, баян, гітара, выкананне на якіх развіваецца не менш актыўна, чым на ўласна беларускіх народных інструментах.

Яшчэ адна рыса беларускай народна-інструментальнай культуры вывучаемага тыпу, якая адрознівае яе ад многіх аналагічных культур, — пераважная акадэмічная накіраванасць. Усе віды творчасці ў гэтай галіне: кампазітарская, выканальніцкая, педагагічная, а таксама дзейнасць майстроў па вырабе музычных інструментаў — арыентаваны на класічныя нарматывы агульнаеўрапейскага акадэмічнага інструменталізму. Менавіта да іх прыстасоўваюцца, ім падпарадкоўваюцца традыцыі фальклорнай спадчыны. І гэта нягледзячы на тое, што ля вытокаў народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі ў Беларусі стаялі разам з музыкантамі акадэмічнага профілю і патомныя народныя музыкі, такія як І.Жыновіч, С.Навіцкі, Х.Шмелькін.

Але найбольш яркай, адметнай рысай сцэнічнай народна-інструментальнай культуры Беларусі з'яўляецца ўстойлівая цікавасць кампазітараў і выканаўцаў да цымбалаў. Вынік гэтага — прыярытэтнае развіццё ў рэспубліцы цымбальнай выканальніцкай школы, высокі мастацкі ўзровень якой сёння прызнаны ва ўсім свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І яшчэ адну рысу народна-інструментальнай культуры Беларусі неабходна адзначыць. Гэта цеснае спалучэнне выканальніцкай традыцыі з кампазітарскай творчасцю. З аднаго боку, высокі ўзровень музыкантаў-выканаўцаў стымулюе творчую актыўнасць кампазітараў рэспублікі ў галіне народна-інструментальнай музыкі. З другога — створаныя імі арыгінальныя творы садзейнічаюць развіццю выканальніцкага майстэрства салістаў і народна-інструментальных калектываў. У сваю чаргу эвалюцыя выканальніцкай і кампазітарскай практыкі абумоўлівае паступовую эвалюцыю матэрыяльнай асновы народна-інструментальнай культуры, бо час ад часу выклікае неабходнасць канструкцыйных змен народных інструментаў. Такім чынам, плённае і параўнальна хуткае фарміраванне ў Беларусі культуры разглядаемага тыпу дэтэрмінавана існуючай непарыўнай дыялектычнай сувяззю паміж трыма яе асноватворнымі кампанентамі — выканаўцам, інструментам і музыкай, якія забяспечваюць устойлівае развіццё музычнай культуры ўвогуле.

Такім чынам, як сведчыць аналіз народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі Беларусі, ёй уласцівыя шматлікія атрыбутыўныя рысы на ўзроўнях як агульнага, тыпалагічнага плана, так і канкрэтных праяў асобнай нацыянальнай культуры. Паслядоўнасць і яркасць выяўлення яе асноватворных тыпалагічных рыс дазваляюць сцвярджаць, што яна дастаткова развіта ва ўсіх складаючых яе кампанентах і ў параўнанні з культурамі іншых народаў ўяўляе пераканаўчы ўзор культуры падобнага тыпу. У той жа час уласцівыя ёй рысы нацыянальнай своеасаблівасці даюць падставу да прызнання яе бясспрэчнай самастойнасці і мастацкай самабытнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ